# СПЕЦЫФІКА ДЗЕЙНАСЦІ ПУБЛІЧНАЙ БІБЛІЯТЭКІ ЯК АГЕНТА САЦЫЯЛІЗАЦЫІ

**А.А. Валевіч**
*аспірант УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*
*(Рэспубліка Беларусь, г. Мінск)*

Аналізуючы дзейнасць публічнай бібліятэкі як сацыякультурнага інстытута, становіцца відавочным тое, што яна была створана для задавальнення вызначаных сацыяльных патрэбнасцей і што яе развіццё цесна звязана не толькі з гісторыяй мыслення, але і са змяненнямі ў сістэме каштоўнасцей вызначанага грамадства. Змена сістэмы каштоўнасцей залежыць ад змянення сацыякультурнай сітуацыі пэўнай краіны. Бібліятэцы неабходна своечасова рэагаваць на гэтыя змены, прытрымлівацца ракурса сацыякультурных нававвядзенняў, адлюстроўваць мэты, якія ставіць грамадства. Гэта патрэбна для таго, каб бібліятэка, у сувязі са змяненнем сістэмы каштоўнасцей, магла забяспечваць інфармацыйную падтрымку, задавальняць сацыяльныя, культурныя, інфармацыйныя запатрабаванні індывіда, і тым самым садзейнічаць яго сацыялізацыі.

З’яўляючыся прыхільнікамі педагагічнага падыходу, пад сацыялізацыяй будзем разумець працэс засваення і ўзнаўлення чалавекам культурных каштоўнасцей, сацыяльных норм, установак, узораў паводзін, яго самаразвіццё і самарэалізацыя ў тым грамадстве, у якім ён жыве [5, с. 345].

Не толькі айчынныя, але нават і замежныя вучоныя адзначаюць сацыялізуючы ўплыў бібліятэкі на індывіда. Так, амерыканскі бібліятэказнавец Д.Х. Шыра [7, с. 67] і нямецкі бібліятэказнавец Х. Кунцэ [3, с. 291] сцвярджаюць, што бібліятэкі, з’яўляючыся часткай камунікацыйнай сістэмы, удзельнічаюць у захаванні і распаўсюджванні культурных духоўных каштоўнасцей і далучэнні карыстальнікаў да іх, а гэта значыць – сацыялізацыі.

Вядома, што важнай складаючай працэса сацыялізацыі выступаюць тыя, хто ўплывае на гэты працэс і фарміруе яго. Іх называюць агентамі сацыялізацыі. Да іх адносяцца людзі і сацыяльныя інстытуты. Першых лічаць індывідуальнымі агентамі сацыялізацыі, другіх – калектыўнымі [1, с. 9].

Навукоўцы ў галіне педагогікі і сацыялогіі асноўнымі агентамі сацыялізацыі лічаць масавую інфармацыю, міжасабовыя зносіны, вучэбную і працоўную дзейнасць. Так, масавая інфармацыя ў наш час набывае асобую ролю. Яна пранізвае літаральна ўсе сферы жыццядзейнасці асобы. Даследаванні паказваюць, што ў юнацкім узросце масавая інфармацыя як канал атрымання ведаў аб свеце займае адно з першых месцаў. Але тут важна іншае. У карыстальніка, які наведвае бібліятэку і выбірае канал атрымання ведаў менавіта дакумент, паяўляецца магчымасць «гаварыць з мінулым», «удзельнічаць ў цяперашнім» і «заглядваць у будучыню». Прыходзячы ў бібліятэку, ён здзяйсняе адбор тых дакументаў, якія яму неабходны, ці, якія б

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ён жадаў прачытаць. У супрацьпастаўленне гэтаму масавая інфармацыя знаходзіцца пад поўным кантролем перадатчыка. Менавіта ён вызначае, якая інфармацыя будзе передавацца на масавую аўдыторыю. Ва ўмовах бібліятэкі карыстальнікі атрымліваюць не адно і тое ж паведамленне, як у выпадку тэле- ці радыёперадачы, а, наадварот, кожны індывідуальна шукае тую інфармацыю, якая адказвае яго запатрабаванням. Больш таго, карыстальнік можа зноў і зноў звяртацца да выбранай інфармацыі, калі гэта яму неабходна. Мабыць не будзе залішнім зрабіць выснову, што сродкі масавай інфармацыі нясуць, галоўным чынам, аўтарытарны характар, а бібліятэка ўсё ж дэмакратычна па сваей сутнасці.

Улічваючы ўплыў масавай інфармацыі на сацылізацыю індывіда, асобных груп і грамадства цалкам, адзначым, што большую ролю ў дадзеным працэсе адыгрываюць зносіны, якія праяўляюцца не толькі на міжасабовым але і на міжгрупавым узроўні. Адзначым, што калі ў педагогіцы асноўныя сродкі сацыялізацыі: камунікацыя і зносіны, то ў бібліятэказнаўстве – бібліятэчная камунікацыя і бібліятэчныя зносіны. Улічваючы спецыфіку іх праяўлення ва ўмовах публічнай бібліятэкі, адзначым, што бібліятэчныя зносіны, бібліятэчная камунікацыя, маюць сацыялізуючы характар. Не здарма Ю.П. Мяленцьева абгрунтавала істотную ролю бібліятэкі, яе важнейшага працэса – бібліятэчнага абслугоўвання ў працэсе сацыялізацыі асобы, а таксама зносін – як яго неабходнага атрыбута [4, с. 100]. Зыходзячы з гэтага, С.А. Езава выдзеліла камунікатыўную сацыялізацыю ва ўмовах публічных бібліятэк, так як ёю было вызначана, што камунікацыя мае сацыялізуючы характар [2, с. 101].

Як вядома, бібліятэчныя зносіны – гэта працэс, звязаны не толькі з запатрабаваннямі бібліятэчнай дзейнасці, але і з асабістымі запатрабаваннямі карыстальнікаў, у тым ліку і абумоўленымі праблемай сацыялізацыі. Адзначым, што сфера зносін, камунікацыі з’яўляецца адной з асноўных сфер сацыялізацыі, у сувязі з гэтым бібліятэчныя зносіны набываюць асаблівае значэнне. Менавіта, у аснове адносін суб’ектаў працэса бібліятэчных зносін павінны ляжаць этычныя нормы, як грамадзянскія, так і прафесійныя (з боку бібліятэкара). Іх выконванне з’яўляецца, на наш погляд, крытэрыем эфектыўнасці сацыялізуючага ўплыву не толькі зносін і камунікацыі, але і дзейнасці бібліятэкі ўцэлым.

Наступным агентам сацыялізацыі выступае вучэбная дзейнасць, якая, безумоўна, звязана з адукацыйным працэсам. Сацыялізацыя праз адукацыю прадугледжвае набыцце ведаў, вопыту, вызначаных у пэўным грамадстве каштоўнасцей і норм. Адукацыйнае асяроддзе бібліятэкі, забяспечваючы сацыялізацыю асобы, разам з тым фарміруе і асабістую інфармацыйную прастору індывіда, і інфармацыйную прастору соцыума, паколькі «інфармацыйная прастора дастаткова высокага ўзроўню ствараецца ўзаемадзеяннем людзей ведаючых, інтэлектуальна развітых і духоўна багатых, а сістэматычныя веды ўжо даўно звязаны ў грамадстве з адукацыяй» [6, с. 7]. Як заўважыў Э.П. Семянюк, «за ўсёй шматаспектнасцю адукацыі прагледжваецца яе генетычная сувязь з вельмі шырокім паняццем, да якога

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

яна ўзыходзіць – навучаннем» [6, с. 2]. Навучанне звязана з такім важным сацыякультурным фенаменам, як выхаванне (г.зн. выпрацоўванне ў чалавека вызначаных якасцей). Калі навучанне накіравана на фарміраванне канкрэтных ведаў і навыкаў у розных сферах, то выхаванне прызвана забяспечыць развіццё асноўных вызначальных рыс асобы.

Увогуле, ў працэсе вучэбнай дзейнасці бібліятэка фарміруе ў сваіх чытачоў інфармацыйную культуру (інфармацыйную, бібліятэчна-бібліяграфічную і камп'ютарную граматнасць, культуру чытання), выкарыстоўваючы такія формы як бяседы, конкурсы знатакоў, літаратурныя гульні і г.д. Фарміраванне інфармацыйнай культуры з'яўляецца адным з элементаў сацыялізацыі. Гэта значыць, што публічная бібліятэка павінна шчыльна ўзаемадзейнічаць са школамі і іншымі ўстановамі адукацыі пры фарміраванні інфармацыйнай культуры. Задача бібліятэкі заключаецца ў тым, каб вучыць чытачоў выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні ў вучэбнай рабоце, у паўсядзённым жыцці і ў працэсе карыстання бібліятэчна-бібліяграфічнымі рэсурсамі.

Усведамляючы ролю працоўнай дзейнасці як агента сацыялізацыі, трэба вызначыць як бібліятэка можа паўплываць на індывіда ці групу людзей, якія працуюць у тым, ці іншым працоўным калектыве. Працоўная дзейнасць як агент сацыялізацыі ў бібліятэцы займае асобае месца. Менавіта на гэты працэс бібліятэка ўздзейнічае як бы ўскосна. Як сацыякультурны інстытут, яна адыгрывае важную ролю, садзейнічаючы рэалізацыі правоў грамадзян на інфармацыю, забеспячэнню бесперапыннай адукацыі на ўсіх яе ўзроўнях, аказваючы сацыяльна-псіхалагічную падтрымку насельніцтву і г.д. Таксама бібліятэка інфармацыйна забяспечвае розныя галіны працоўнай дзейнасці, можа прадастаўляць літаратуру па пытаннях канфлікталогіі, псіхалагічных навуках і г.д. Рэалізацыя гэтых і шмат іншых напрамкаў дзейнасці дапамагаюць індывіду больш якасна і хутка праходзіць сацыялізацыю ў працоўным калектыве.

Такім, чынам, публічная бібліятэка, як сацыяльны інстытут, гэта менавіта тое месца, дзе карыстальнік атрымлівае доступ да культурных каштоўнасцей у дапамогу паўнавартаснай сацыялізацыі. У сваёй дзейнасці публічная бібліятэка прымае актыўны ўдзел па сацыялізацыі індывіда, груп карыстальнікаў, нараўне з асноўнымі агентамі сацыялізацыі. Больш таго, у сацыялізуючым працэсе бібліятэка выходзіць на розныя ўзроўні: і на групавы, як сацыякультурны інстытут, і на індывідуальны, з дапамогай зносін, бібліятэчнага персаналу, напрыклад, пры абслугоўванні. Гэта вызначае спецыфіку сацыялізуючага ўплыву публічнай бібліятэкі і даказвае, што, яна з'яўляецца агентам сацыялізацыі.

1. *Добреньков, В.И.* Фундаментальная социология : в 15 т. / В.И. Добреньков, А.И. Кравченко. – М. : ИНФРА-М. – Т. 8 : Социализация и образование. – 2005. – 1040 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. *Езова, С.А.* Библиотекарь и читатель : типы поведения / С.А. Езова. – М. : Либерея-Бибинформ, 2009. – 109 с. – (Библиотекарь и время. XXI век).

3. *Кунце, Х.* Избранное : пер. с нем. / Х. Кунце. – М. : Книга, 1983. – 315 с.

4. *Мелентьева, Ю.П.* Библиотека и юношество: поиски взаимопонимания: библиотечное обслуживание как процесс социализации личности / Ю.П. Мелентьева. – М. : Ин-т психологии РАН, 1999. – 160 с.

5. *Жук, А.И.* Основы педагогики : учеб. пособие / А.И. Жук [и др.] ; под. ред. А.И. Жука. – Минск : Аверсэв, 2003. – 349 с.

6. *Семенюк, Э.П.* Развитие информационного пространства и прогресс общества / Э.П. Семенюк // Науч. и техн. информация. Сер. 1. – 1997. – № 1. – С. 1–12.

7. *Шира, Д.Х.* Введение в библиотековедение / Д.Х. Шира ; под ред. Н.С. Карташова; [предисл. Р. Гиляревского]. – М. : Высш. шк., 1983. – 256 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ